# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР 13 ЛЮТАГА 1992 № 2 (1698)


## З ІМЯНІНАМІ, РОДНЫ ЛІЦЭЙ!

Адышоў заклапочаны студзень,
Знікне хутка і люты з вачэй,
Ды са святам чаргуецца будзень...
— З імянінамі, родны ліцэй!

Адчуваеш, як ранкам зімовым
Ад прыветных усмешак цяплей,
І сняжынкамі свецяцца словы:
«З імянінамі, родны ліцэй!»

Л. РУБАШНАЯ,
выкладчыца беларускай літаратуры.

### ПАМІЖ НАМІ...

## ІНШАЙ АЛЬТЭР—НАТЫВЫ НЯМА!

Такім чынам, мы жывём ужо два гады. Так, менавіта жывём, жывём як адно цэлае, як ліцэй. Мы не падпарадкоўваемся вядомаму закону «Дом — ліцэй — дом», мы жывём па сваіх законах у гэтым доме. Мы жывём па сваіх правілах, якія расквечваюць наша жыццё, што складаецца з формул, кніг, вопытаў, зборнікаў вершаў. Няхай наш «збор законаў» часткай і запазычаны ў амерыканцаў, але зроблена гэта з уласцівай ліцэю іскрынкай: дакладнасць фізікаў, падлічаная матэматыкамі з мінімальнай хібнасцю, запал радыёфізікаў, рамантычнасць філолагаў — на гэтай глебе паспяхова прыжыўся «вірус» прыкладных матэматыкаў. Ён можа развівацца толькі сярод цяпла, дабрыні, узаемаразумення, даверу і адкрытасці . Такі клімат і падтрымлівае ліцэй — настаўнікі і мы. Абавязкова трэба адзначыць, што калі б не настаўнікі, магчыма, нічога б і не было, бо менавіта ад іх спачатку залежыць, даць ці не свабоду ініцыятыве і смелым ідэям. Значную працу ўклалі ў стварэнне гэтай атмасферы настаўнікі і першыя выпускнікі (1991 года). Мы, калі з'явіліся ў ліцэі, адчулі гэты «вольны дух».

У цэлым у нас цудоўныя адносіны. Пры гэтым мы не спяваем дыфірамбы настаўнікам, не спрабуем пусціць пыл у вочы недасведчаным. Нашы выкладчыкі адчуваюць на сябе звычайны цяжар штодзённых праблем і клопатаў, але ідуць да нас з успешкай і адкрытай душой. Іх ніколі не застанеш знянацку, не завядзеш у тупік каверзным пытаннем. Яны ніколі не пакінуць вучня абыякавым да свайго прадмета. Нягледзячы ні на што, нашы дамы заўсёды выклікаюць захапленне вытанчанасцю сваіх густаў і манер, а спадары асляпляльнай галантнасцю і ўвагай. Ну як? Калі ў вас пасля такой інфармацыі з'явілася адчуванне кіслаты, сухасці і прыкрасці адначасова, не хвалюйцеся. Букет гэтых адчуванняў разбурыць іншая навіна: нашы настаўнікі «травяць» анекдоты, танцуюць у стылі «рэп», гуляюць у тэніс і г. д. Толькі не думайце, што яны складаюцца цалкам са станоўчых рысаў. Часам ім не хапае стрыманасці, часам рашучасці. Здараецца, яны злоўжываюць гэтымі якасцямі. Бывае, настаўнікі не разумеюць ліцэіста, быццам, не падазраюць, што апошні жыве сваім паўнацэнным жыццём, што ў яго таксама бываюць неадкладныя справы, што яму таксама даводзіцца вырашаць свае праблемы. Па гэтай прычыне ў нас часам узнікаюць спрэчкі, сваркі, справа можа зайсці ў тупік, з якога няма выйсця. Няма выйсця? «Скінь маму з цягніка!»

А наогул, вы можаце сядзець за сталом, на стале, стаяць на галаве — вучыцца ў ліцэі можна ў любым становішчы, толькі б вам было зручна і вы паспявалі. Адсюль вывад: пры ўсім багацці выбару — іншай альтэрнатывы няма!

Марына УРБАНОВІЧ,
Наталля ВАЛЬВАЧОВА,
вучаніцы 11 М-2 класа.

## РАСЦЁМ, БРАТКІ!

Вы адчуваеце, як мы расцём? Пакрысе, але даволі ўпэўнена робім першыя крокі. Тым больш прыемна, што нашы ногі ступаюць па паркету калідораў роднага будынка, які дастаўся нам у няроўнай барацьбе з мінскай бюракратыяй. І побач з намі крочаць нашы выкладчыкі. А ў хуткім часе прыгожае па на харэаграфіі можна будзе выканаць ва ўласнай спартыўнай зале (якую вось ужо амаль паўгода рамантуюць будаўнікі). Тут жа можна будзе здзівіць усіх сваімі фізічнымі здольнасцямі. Магчыма ў ліцэі з'явяцца свае рэкардсмены, а спіс спецыяльнасцей папоўніцца яшчэ адной, дзе будуць рыхтаваць дыскжакеяў?

Жыццё ў ліцэі такое, што нельга не ганарыцца ім. Я ўжо не кажу пра розныя там дыскатэкі, хіт-парады. Успомніце нашых былых ліцэістаў, якія пакінулі свой першабытны след у гісторыі ліцэя. На іх долю выпала пакутлівае жыццё ў СШ №№ 189 і 102, а ліцэйскую «лямку» давялося цягнуць, на жаль, не два, а паўтары гады. І больш за сотню выпускнікоў мінулага года ўпіліся сваімі малочнымі зубкамі ў граніт навукі на І курсе БДУ. Дай, Божа, каб іх зубы не зламаліся, каб не давялося звяртацца да стаматолага.

Зразумела, напярэдадні свята нельга забываць пра тых, хто бескарысліва растрачвае на нас нервы і забяспечвае ідэямі. Пра тое, што настаўнікі не шкадуюць сіл, сведчаць поспехі ліцэістаў на розных алімпіядах. Ну, а пра любоў ліцэістаў да выкладчыкаў можна меркаваць па тых непадробных слязах, што ракою цяклі на выпускным вечары.

Год, пражыты пасля першых імянін, зрабіў ліцэістаў больш сур'ёзнымі. Яны ўжо не тыя вясёлыя немаўляты, хаця такія ж фантазёры, што мараць стаць свяцiламі навукі, паступіць у Гарвардскі універсітэт або жыць у Швейцарыі. Што ж, марыць ніколі не шкодна, тым больш у наш час. Шкада, што не ўсё так лёгка, як у той песні: «Нажми на кнопку — получишь результат». Але, можа, Фартуна ўсміхнецца ўсім нам, і тады!..

Так што, ліцэіст, заставайся такім жа летуценным, вер у свае сілы і сілы сябра, не паддавайся варожым плёткам ці прадказальнікам, якія прарочаць табе «вылет» са сцен ліцэя пад час чарговай сесіі. Адным словам, не падай духам і... еш імянінны каравай, на якім пакуль што (або ўжо) дзве свечкі. Са святам!

Марына АЖГІРЭЙ.

### ПАДРУЧНІК ПА ГІСТОРЫІ

## ПЕДАГАГІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў АСОБНА ЎЗЯТЫМ ЛІЦЭІ

*Школа-ліцэй пры БДУ адкрылася ў студзені 1990 года. Нацыянальнае свята — Дзень нараджэння ліцэя — афіцыйна адзначаецца ў другую суботу лютага.*

*У студзені 1990-га ў ліцэі працавалі 7 штатных настаўнікаў і 28 выкладчыкаў універсітэта. У верасні 1991-га тут працуюць ужо 30 штатных настаўнікаў і 27 выкладчыкаў універсітэта. У ліцэі навучаецца 393 чалавекі.*

*Асаблівасць нашай школы ў тым, што ўсе ліцэісты абавязаны ўдзельнічаць у школьным туры алімпіяд па прадметах. Вынікі часам непрадказальныя і для ліцэістаў, і для настаўнікаў. У рэспубліканскіх прадметных алімпіядах удзельнічалі 32 прадстаўнікі ліцэя. З іх 13 атрымалі заахвочваючыя дыпломы, астатнія ўвайшлі ў дзесятку лепшых у рэспубліцы па матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы, англійскай, рускай, беларускай мовах. Прызёры Усесаюзнай алімпіяды па матэматыцы — Сяргей КУЗЬМІЧ і Кірыл ХВЕНКІН (ІІ-ПМ-І), па інфарматыцы — Міхаіл ВАШКЕВІЧ (ІІ-ПМ-1).*

*Упершыню ў рэспубліцы ў 1991 годзе быў арганізаваны фізбой ці турнір юных фізікаў. Дзве каманды ліцэя як пераможцы паспяхова ўдзельнічалі ва Усесаюзным турніры ў Адэсе. Капітан каманды Максім Зайцаў (ІІ-Ф-2) адзначаны дыпломам у асабістым заліку. Поспех «фізбайцоў» па праву дзеляць з імі іх выкладчыкі: Леанід Рыгоравіч МАРКОВІЧ і Анатоль Іванавіч СЛАБАДЗЯНЮК.*

*Цэнтр «Філантропія» пры Савецкім фондзе міра стаў прешым мецэнатам ліцэя. Са сродкаў, выдзеленых Цэнтрам ліцэю, прызначана 6 стыпендый — Вячаславу ПАРШЫНУ, Аляксандру РАДЗЬКО, Паўлу ПЛАШЧЫНСКАМУ, Артуру ФЕДЧАНКУ, Аляксандр КСЕНАФОНТАВУ, Яўгену ВАСІЛЬЕВУ.*

*Са сродкаў Цэнтра заахвочаны выкладчыкі, якія паспяхова працуюць з ліцэістамі: Анатоль Іванавіч СЛАБАДЗЯНЮК (фізфак), Уладзімір Іванавіч ЗАНЬКОВІЧ (ФРЭ), Леанід Рыгоравіч МАРКОВІЧ (фізфак), Ігар Іванавіч ВАРАНОВІЧ (фізфак), Алег Ігнатавіч ТАЎГЕНЬ (мехмат).*

*За паўтара гады ў ліцэі адбыліся наступныя падзеі:*

— *дэбют новенькіх;*
— *вясна ў ліцэі;*
— *Дзень майскага жука;*
— *ліцэйскія каляды;*
— *Дзень св. Валянціна;*
— *«Hello Day»*
— *Новы год;*
— *імяніны ліцэя;*
— *беларускія вячоркі;*
— *першы ў гісторыі ліцэя апошні званок;*
— *першы турзлёт;*
— *першы выпускны баль;*
— *экскурсіі ў Тракай, Мір, Нясвіж, Санкт-Пецярбург, на радзіму Якуба Коласа.*

### ПРАГНОЗ НА ЗАЎТРА

## ПОСПЕХ НАРАДЖАЕ ПРАБЛЕМУ

Ліцэю ўжо два гады. За гэты час мы далучылі да навукі некалькі соцень цудоўных юнакоў і дзяўчат, многія з якіх цяпер з'яўляюцца студэнтамі. За два гады існавання ў межах традыцыйных прафіліруючых прадметаў — фізікі, матэматыкі і філалогіі — ліцэю стала яўна цеснавата. Нашы навучэнцы выявілі свае здольнасці і ў іншых навуках, менавіта ў хіміі.

Лепшы юны хімік сталіцы СНД — наш выхаванец. Гэта Анатоль ЛІТОШКА (11 $Ф_2$), пераможца гарадской алімпіяды і лаўрэат усесаюзнага завочнага конкурса часопіса «Химия и жизнь». І ён не адзіны. Першае месца ў гарадской алімпіядзе па хіміі заняла Аня АСІНОЎСКАЯ — дзесяцікласніца з матэматычнага класа, а яе аднакласніца Юля АРЖАЕВА — на сёмым месцы.

Гэтыя вынікі дасягнуты ва ўмовах скарочанага курсу вывучэння хіміі: адна гадзіна ў тыдзень для дзесяцікласнікаў і дзве — у выпускнікоў. Застаецца толькі здагадвацца аб магчымых поспехах такіх таленавітых вучняў, калі б яны вучыліся ў спецыялізаваным хімічным класе.

Відаць, настаў час паставіць пытанне перад кіраўніцтвам універсітэта і хімічным факультэтам аб адкрыцці такога класа ў нашым ліцэі. Пры станоўчым выніку юныя хімікі будуць мець магчымасць найлепш выявіць свае здольнасці, а хімфак атрымае добрае папаўненне.

Т. КАЛЕВІЧ,
выкладчыца хіміі.

### АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## ЛІЦЭІСТАМ ШАНЦАВАЛА

Адной з форм пазаўрочнай работы з вучнямі старэйшых класаў з'яўляецца правядзенне алімпіяд па прадметах. Вынікі гэтай работы выкарыстоўваюцца як крытэрый ацэнкі дзейнасці выкладчыка, узроўню яго кваліфікацыі. Акрамя таго, алімпіяды даюць магчымасць меркаваць аб тым, як падрыхтаваны вучні пэўнай школы і параўноўваць іх узровень з іншымі ўдзельнікамі спаборніцтваў.

Ва ўнутрышкольнай алімпіядзе, якая праводзіцца ў нашым ліцэі, удзельнічаюць усе вучні. Шкада, што існуе абмежаванне на колькасць удзельнікаў у гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах: многія навучэнцы ліцэя дастойны па свайму ўзроўню выступаць там, але не ўсе яны маюць такую магчымасць.

Дзякуй кіраўніцтву гарадскога ўпраўлення народнай адукацыі, якое знайшло магчымасць дазволіць нашым вучням удзельнічаць у гарадской алімпіядзе, нягледзячы на строга вызначаныя квоты. Ліцэістам спадарожнічаў поспех!

У спаборніцтвах па фізіцы сярод дзесяцікласнікаў другое месца заняў В. КАТКОЎСКІ, чацвёртае — В— ЛІСІНЕЦКІ, пятае — Ю. АДАМАЎ. Сярод вучняў 11-га класа першыя шэсць месцаў — у нашых. Іх занялі адпаведна А. БЕРШТЭЙН, М. ЗАЙЦАЎ, А. КАЦАЎ, С. ЛАПКО, М. ХУСІД і Д. БАГАМОЛАЎ.

Не менш бліскуча выступілі матэматыкі. Сярод дзесяцікласнікаў першынствавала С. РАСХОДНІКАВА, на другім месцы — Т. АКАТАВА, на трэцім — А. АФАНАСЕНКА, на чацвёртым — Ю. САМСОНАЎ, А. ТРАФІМЧУК і А. ХАРЫН. Вучні 11-га класа нашага ліцэя таксама занялі ўвесь п'едэстал:

С. КУЗЬМІЧ (І месца), К. ХВЕНКІН (ІІ месца) і А. ЕМЕЛЬЯНЕНКАЎ (ІІІ месца),

На алімпіядзе па беларускай мове першай сярод дзесяцікласнікаў была Н. СТАРШЭЎСКАЯ, трэцяй — М. ШУШКЕВІЧ, чацвёртай — К. ШУЛЯКОЎСКАЯ. Іх сяброўкам з 11-га класа спадарожнічаў той жа поспех: І. МІХАЙЛАВА — першая, М. САЛАЎЁВА — другая, М. БАХАРАВА — чацвёртая.

Першае месца ў спаборніцтвах па рускай мове заняла вучаніца 11-га класа В. ВЕРНІКОЎСКАЯ, на чацвёртым радку сярод дзесяцікласнікаў — МАРКІНА.

Мы разумеем, што вучні звычайных сярэдніх школ пастаўлены не ў тыя ж умовы, што навучэнцы ліцэя. Таму плануем арганізаваць алімпіяды ці турніры па прадметах сярод вучняў новых тыпаў навучальных установ (ліцэі, гімназіі, каледжы).

Г. ПАЛЬЧЫК,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце.



## «ЭХ, ЧАРЭШНЯ, МІЛАЯ ЧАРЭШНЯ!..»

Летам мінулага года мне давялося быць кіраўніком працоўнага дэсанта, які пабываў у Балгарыі. У складзе нашай групы было 50 ліцэістаў і двое настаўнікаў: акрамя мяне, яшчэ Уладзімір Мікалаевіч Янчэня.

Нам пашчасціла ўбачыць казачны край, і мы вельмі ўдзячны за гэта фірме «Арго-М». Мы жылі ў цэнтры Балкан, працавалі на заводзе, які выпускае плодаагароднінную прадукцыю. Першыя два тыдні мелі справу з чарэшняй, потым — з агуркамі. «Эх, чарэшня, мілая чарэшня!» — спявалі ліцэісты кожную раніцу, і гэта вельмі падбадзёрвала. Працаваць даводзілася па 7 гадзін у змену. Нашы вучні дэманстравалі высокую арганізаванасць і прадукцыйнасць працы, за што сталі любімцамі ў рабочых і адміністрацыі завода.

Я і сёння адчуваю гонар за 50 сваіх падапечных, гонар і нейкую асаблівую сімпатыю да іх. Часта ўспамінаю словы дырэктара завода: «Дзе ж гаспадзін Жук бярэ такіх працаздольных, вясёлых і няўрымслівых дзяцей?»

І сапраўды, Аляксандр Іванавіч, дзе?

**А. МЕЦЭЛЬ,**
**выкладчык фізкультуры.**

## З ДАЛЁКАЕ ПРЫВІТАННЕ БАЛГАРЫІ,
### ці Марынаваныя агурочкі

«Мне надоело только петь про заграницу,
Возьму билет до Горной Луки — и вперед!..» — так пачыналася песня-гімн ліцэістаў, якія пабывалі летам 1991 года ў Балгарыі, перафразіраваная з даволі вядомага хіта групы «Камбінацыя» «Бухгалтар». Выконваецца стоячы (можна лежачы) у брудным парваным халаце з адтапыранымі кішэнямі. У кішэнях — банкі з агуркамі, у роце — костачкі ад чарэшні... Так было...

Спачатку доўгая дарога, вясёлая мытня і першыя яскравыя балгарскія зоркі на чорным аксаміце неба, якія адцянялі строгія абрысы гор. Усё гэта «не наша», новае, пачынаючы з пад'ёма ў 5 гадзін раніцы і заканчваючы партрэтамі піянераў-герояў, якія шчодра ўпрыгожвалі сцэны цяпер «нашага» дома. Мірныя жыхары пасёлка Горна Лука нават і не падазравалі, каму яны далі прытулак, каго абагрэлі і накармілі. Дарэчы, аб ежы... пардон, не дарэчы... але ўсё ж. У нашым меню трапляліся часам вельмі дзіўныя стравы, напрыклад, салодкія халодныя макароны з брынзай на дне, сачавіца і вельмі смачны, але чамусьці ў талерках, кампот з чарэшні — што ж зробіш, нацыянальны, скажам так, каларыт. А мы ж працавалі! І вельмі хацелі есці, бо не маглі прывыкнуць да сюрпрызаў балгарскай кухні. Таму як толькі канчалася «ціхая гадзіна», на працягу якой многія сапраўды спалі як забітыя, пачыналася ўсеагульная вячэра. Яна працягвалася колькі хочаце, хоць да поўначы, і складалася з хлебакаўбасыпячэння-варэннесушкісалатушонказгушчонкасыр і г. д. Елі разам і асобна, запівалі чым траплялася. Тапляліся рознае.

А яшчэ там «не нашы» горы, на якія цяжка забрацца, але з якіх лёгка падаць, вельмі прыгожыя. І горная рачулка, чыстая-чыстая, без назвы, упадае ў возера Язавір. І вадзіцелі там самыя добрыя: за «дзякуй» куды хочаш завязуць, хоць у Сафію. І наогул, там усе людзі добрыя, акрамя тэхнатроніка (тэхнолаг на заводзе): ён злы, лысы, агуркоў есці не дазваляў, ледзь што, як прыбяжыць, як заскуголіць: «Господина! Почему едим огурчики?!!» «Господа в Париже, а едим потому, что есть хочется, дядя!» А так усе добрыя. І мясцовыя «баргалы» не чапляліся, і ў дзяўчат пад вокнамі амаль не стаялі. І імёны ў іх прыгожыя, «не нашы»: Цветалін, Іван, Веселін, Красамір. І песні іх цікавыя, памятаеце, «Чыкі-чыкі» — мясцовы рэп?

І наогул — нам там вельмі спадабалася. Ад'язджаць не хацелася: і сумна, і шкада, што ў Варну на Залатыя Пяскі не трапілі, і — ах, гэты Сонечны бераг! Зараз амаль для ўсіх пяцідзесяці чалавек, я думаю, гэта як казачны сон. Мы хочам зноў вярнуць яго.

Аляксандр Іванавіч! Уладзімір Мікалаевіч! Дзяніс! А можа кінем усё і махнём у Горну Луку? А?

**Група вучняў, якія пабывалі ў Горнай Луцы.**

да дошкі выклікаецца адміністрацыя

# КАРОНА ЛІЦЭЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

***Адміністрацыя ёсць адміністрацыя. Караючы і накіроўваючы орган. Не было б яе, мы б... так развярнуліся, такога б нарабілі! А калі задумацца, дык кім бы былі мы з вамі без нагляду і парад адміністрацыі? І ці быў бы наогул ліцэй! Так што давайце ўважліва паслухаем...***

**Аляксандр Іванавіч ЖУК, кандыдат педагагічных навук, дырэктар.**

**1. У адной з перадач Беларускага тэлебачання прагучала думка аб тым, што калі ў школе праводзяць хамячыя скачкі, дык гэта — ліцэй. Калі гаварыць коратка, як Вы лічыце, чым адрозніваецца наш ліцэй ад звычайнай школы?**

— Мне здаецца, атмасферай, якая тут уладарыць. Атмасфера сур'ёзных, адказных адносін да галоўнай справы — вучобы, імкненне да дабра і справядлівасці, калі цябе прымаюць такім, які ты ёсць; калі выкладчыкі і ліцэісты разам гуляюць у футбол і спяваюць песні ля вогнішча, удзельнічаюць у «бойках» пад час КВЗ і сустракаюцца «на прызбе»... І калі, нарэшце, праводзяць хамячыя скачкі, чаго не можа дазволіць сабе ні адна звычайная школа.

**2. Былы Прэзідэнт былога Савецкага Саюза, калі прыйшоў да ўлады ў 1985 годзе, пачаў з антыалкагольнай кампаніі. Вы, «пераехаўшы» разам з ліцэем у новы будынак, пачалі антытытунёвую, Вынік кампаніі Міхаіла Сяргеевіча вядомы. У сувязі з гэтым у нас да Вас два пытанні:**

**а) Ці лічыце Вы, што Ваша барацьба супраць курэння прывядзе да лепшых вынікаў?**

**б) Ці выконваеце Вы самі сваё распараджэнне?**

— Я не прыхільнік рознага роду кампаній. У нас гэта ўсур'ёз і на доўгі час. Радуюся, што ліцэісты гэта зразумелі і ў «родным» будынку не кураць, хаця сам часам бываю грэшны. Думаю, што на гэтай глебе ў нас не будзе канфліктаў. Ну а калі будзем мець у гэтым патрэбу, заўсёды зможам «выкурыць трубку міра».

**3. Ці лічыце Вы нашу школу элітарнай?**

— Вы ўсялякім выпадку, мы да гэтага імкнемся. І мне хацелася б, каб з гэтых сценаў выходзілі не проста лепшыя навучэнцы сярэдніх школ, але і духоўна багатыя, фізічна развітыя, шчодрыя і шчырыя маладыя людзі.

**4. У Вашым кабінеце з'явіўся персанальны камп'ютэр. Якая Ваша любімая мова праграміравання?**

— Паколькі камп'ютэр паявіўся нядаўна — ПАСКАЛЬ у стадыі вывучэння. Для адміністратыўных мэтаў маецца шэраг гатовых праграм.

**5. Дазвольце даведацца, на якую тэму Вы, кандыдат навук, пісалі дысертацыю?**

— Тэма дысертацыі была звязана з распрацоўкай спецыяльных сістэм практыкаванняў для арганізацыі апаратыўнай зваротнай сувязі ў навучальным працэсе (у тым ліку з дапамогай ЭВМ).

**Генадзь Уладзіміравіч ПАЛЬЧЫК, кандыдат фізіка-матэматычных навук, намеснік дырэктара па навуковай рабоце:**

**1. Вы — кандыдат фізіка-матэматычных навук, добра валодаеце англійскай мовай і маглі б працаваць не ў школе, а ў прэстыжнай ВНУ (ва універсітэце, напрыклад). Чаму Вы аддаеце перавагу школьнікам перад студэнтамі?**

— Па-першае, ёсць сумяшчэнне. Па-другое, калі я гавару, што працую ва універсітэце, рэакцыя адна, а калі скажу, што працую ў ліцэі,— зусім іншая. Ліцэй больш прэстыжны за унівесітэт. Ну, а па-трэцяе, школьнік можа быць студэнтам, а студэнт школьнікам — ніколі.

**2. Наш ліцэй — жоўты дом за высокай агароджай. Прычым кожны навучэнец мае белы ліцэйскі білет. Ці не здаецца Вам гэта дзіўным?**

— Жоўтым гэты колер называюць толькі неспецыялісты. На самой справе будынак пафарбаваны ў колер «пад арэх». А краты ёсць толькі на вокнах адміністрацыі.

**3. У школе выданы загад ад забароне курэння настаўнікаў і вучняў на тэрыторыі ліцэя. Ці выконваеце Вы яго?**

— А школьнікі — вы?

**4. Ці прымаеце Вы як фізік фізічныя метады ўздзеяння?**

— Не, бо заўсёды памятаю трэці закон Ньютона.

**5. Якая тэма Вашай дысертацыі?**

— «Электронныя уласцівасці і кінэтыка ўтварэння канфігурацыйна-бістабільных тэрмадонараў у монакрышталях германія». (Маецца на ўвазе хімічны элемент, а не краіна, як падумаў спачатку адзін з аўтараў).

**Юрый Дзмітрыевіч ЧУРБАНАЎ, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце.**

**1. Калі б ліцэй закрылі, аб чым бы Вы пашкадавалі ў першую чаргу: аб тым, што згубілі месца работы, пазбавіліся магчымасці зносін з ліцэістамі ці аб тым, што беларуская навука панясе страты?**

— Я б пашкадаваў аб развітанні са сваім самым цёплым у ліцэі кабінетам.

**2. Вы не шкадуеце, што пайшлі працаваць у ліцэй?**

— Няма калі шкадаваць. Не хапае часу.

**3. Што было для Вас самым нечаканым у гэтым навучальным годзе?**

— Поспех ліцэістаў на гарадской алімпіядзе.

**4. Аўтамабіль, на Ваш погляд,— гэта раскоша ці сродак перамяшчэння?**

— У залежнасці ад таго, куды едзеш. Калі спяшаешся — сродак перамяшчэння, не — тады раскоша.

**Ірына Мікалаеўна ПАРШЫНА, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце:**

**1. Што Вам больш за ўсё падабаецца, а што Вы хацелі б змяніць у ліцэі?**

— Падабаюцца мае вучні. Хацела б палепшыць тэхнічную аснашчанасць урокаў англійскай мовы.

**2. Як Вы ацэньваеце тое, што ў ліцэі вольная форма адзення?**

— Станоўча. Я лічу, што ў ліцэі няма праблем з густам.

**3. Ці выпадкова так атрымалася, што амаль ва ўсіх настаўнікаў англійскай другая мова — французская?**

— Выпадкова. Настаўнікаў падбіралі па ведах і ўменню выкладаць англійскую мову, другая мова не ўлічвалася.

**4. Ці не цяжка Вам кіраваць жаночым калектывам настаўнікаў англійскай мовы?**

— Не, не цяжка. Ды й ёсць у нас адзін мужчына.

**5. На вуліцы — зіма, а раздзявалак у ліцэі як не было, так і няма. І вось нейкі вучань у знак пратэсту пакладзе Вам на настаўніцкі стол сваё паліто. Ваша рэакцыя?**

— Я думаю, мае вучні абралі б іншую форму пратэсту. Калі ж такое ўсё ж здарыцца, я проста прыму паліто са свайго стала. І вучню, пэўна, будзе сорамна. Хаця... не ведаю.

**6. Што было самым нечаканым для Вас у гэтым вучэбным годзе ў ліцэі?**

— Розных узрушэнняў было шмат, таму цяжка выбраць самае-самае. І, тым не менш, самай нечаканай была ліцэйская алімпіяда па англійскай мове ў 11-ых класах. Вучні аднолькава з настаўнікамі размаўлялі на чыстай англійскай мове. Другое — азалія, якую мне падарыла адна мая вучаніца. Цудоўная кветка зімой.

**7. Уявіце сабе сітуацыю: былы ліцэіст, скончыўшы ВНУ, хоча вярнуцца ў ліцэй, у якасці настаўніка...**

— Я была б вельмі рада. Асабліва, калі б гэта быў мой вучань. Бо іх я лепш ведаю.

**8. Вы хацелі б, каб Вашы дзеці, у свой час, вучыліся ў ліцэі?**

— Так.

**9. Калі б ліцэй закрылі, аб чым Вы б пашкадавалі ў першую чаргу: аб тым, што згубілі месца работы, магчымасць зносін з ліцэістамі ці аб тым, што беларуская навука засталася, магчыма, без многіх прафесароў і акадэмікаў?**

— Аб тым, што згубіла магчымасць зносін з ліцэістамі.

**10. Уявіце, што Вам трэба выбраць адзін клас з двух, дзе Вы будзеце прымаць залік...**

— Я пагляджу на настаўніка.

**Ала Васільеўна ВІНІЧУК, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце:**

**1. Чым, на Вашу думку, адрозніваецца першае пакаленне ліцэістаў ад паступіўшых у ліцэй у гэтым навучальным годзе?**

— Аб гэтым мы можам пагаварыць на вашым выпускным. Я мала ведаю тых, хто паступіў у гэтым годзен каб параўноўваць іх з першымі ліцэістамі.

**2. Якія адносіны склаліся ў Вас з дзесяцікласнікамі?**

— Пакуль толькі фармальныя. Яны ведаюць, што я — адміністратар, а я ведаю, што яны — новенькія вучні ў школе. Ёсць невялікая група вучняў 10-х класаў, у тым ліку старасты, з якімі мы вырашалі агульныя справы, абмяркоўвалі праблемы бацькоў і дзяцей.

**3. Якія якасці Вы лічыце галоўнымі для вучняў?**

— Годнасць, добрасумленнасць, здольнасць ставіць сябе на месца іншага чалавека.

**4. Якія функцыі, на Ваш погляд, выконвае агароджа вакол ліцэя: ахоўвае нас ад некага ці некага ад нас?**

— Думаю, што агароджа ахоўвае нас. Не цяжка растлумачыць жаданне «загарадзіць» сябе ад «бруднасцей грамадства» і стварыць вакол школы прыгожае, эстэтычнае месца. Спадзяюся, тут будзе шмат кветак і дзіўнай зяляніны.

Але магчыма і так: наша «грамадскасць» зламае любую агароджу і патопча нават самы прыгожы ружовы куст.

**5. Уявіце сябе сітуацыю: які-небудзь незнаёмы чалавек расказвае Вам у ліцэі анекдот пра Вас. Ваша рэакцыя?**

— Анекдоты — гэта бясспрэчная прыкмета папулярнасці. Натуральная рэакцыя — дакладна адчуць яе слабыя і моцныя бакі.

**Мікалай Валяр'янавіч КНЫШ, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце:**

**1. Ці згодны Вы з тым, што ліцэй фарміруе красу будучай беларускай інтэлігенцыі?**

— Згодны, але не зусім. У ліцэй прыйшлі людзі, якія хочуць, могуць, здольныя займацца абранымі дысцыплінамі. Ліцэіст — гэта чалавек, якога цягне да нязведанага, новага. Але каб стаць сапраўдным нацыянальным інтэлігентам, патрэбна надаваць больш увагі пытанням нацыянальнай гісторыі і культуры.

**2. Ці неабходна, на Ваш погляд, увесці ўступны экзамен па беларускай мове для паступаючых у ліцэй?**

— Абавязкова. Тады здымуцца ўсе пытанні з тымі вучнямі, якія не вывучалі мову раней. Ды і любы вучоны (я забягаю наперад) павінен быць пісьменным чалавекам.

**3. Ваш працоўны стол знаходзіцца ў адным кабінеце са сталом другога нашага завуча — Юрыя Дзмітрыевіча Чурбанава, які курыруе матэматычныя класы. Вам гэта дапамагае ці перашкаджае?**

— Ва ўсіх выпадках толькі дапамагае. Асабліва ў час абеду, калі Юрый Дзмітрыевіч прыносіць што-небудзь смачнае.

**4. Вы адказваеце за філалагічныя класы. Ці звязана гэта з тым, што Вам лягчэй знаходзіць кантакт з прадстаўніцамі цудоўнай паловы чалавецтва, якія складаюць большасць Вашых падначаленых?**

— Я не магу сказаць, што гэта лёгка — знайсці разуменне ў філалагінь. Але за 5 гадоў вучобы на філфаку і 2 гады работы ў філалагічных класах я шмат даведаўся аб жыцці філалагінь і сёння не маю праблем. І наогул, мне здаецца, выкладчыкам-мужчынам працуецца ў філалагічных класах вельмі добра.

Я ВАМ ПІШУ...

## Студэнтам быць цудоўна

*Вось першая экзаменацыйная сесія скончылася, і ўжо з'явіўся час для таго, каб крыху адпачыць, пагуляць, забыць пра вучобу, расслабіцца. Можна колькі хочаш хадзіць па дыскатэках, кафэ ці барах. Канешне, табе ўсё можна калі асцярожна. Але, увогуле, можна ўспомніць, што перажылі першакурснікі за апошнія шэсць ці сем месяцаў, што прайшлі пасля школьных выпускных іспытаў, якія цяпер здаюцца зусім не страшнымі і легкімі.*

*Пасля ліцэя ва універсітэце пачалося зусім іншае жыццё. Аб ліцэі засталіся толькі прыемныя ўспаміны. Універсітэт — гэта амаль на ўсе сто працэнтаў вучоба (хаця каму як). І, на мой погляд, для ліцэістаў, якія прывыклі быць у пастаянным асяроддзі з выкладчыкамі, як з роўнымі, і якія наведваюць ліцэй не толькі дзеля вучобы, магчыма, гэта было напачатку цяжкасцю. У першыя дні вучобы складана было ўсядзець на лекцыях, якія чыталі строгія прафесары і дацэнты. Але, між тым, з набліжэннем сесіі гэта ў многіх прайшло, і не толькі ў былых ліцэістаў. Вялікі аб'ём матэрыяла, што патрэбна было як-небудзь вывучыць да сесіі, прымусіў узяцца за галаву і даволі доўга пасядзець над падручнікамі і канспектамі. Універсітэт ёсць універсітэт... І многіх хутка пакінула думка, што ў БДУ, асабліва на першым курсе, будзе вельмі лёгка вучыцца. Можа, гэта і было першай прычынай не надта добрых адзнак у былых ліцэістаў (хацелася б толькі выдатныя мець). Але хто хоча, той зробіць з гэтага разумныя вывады.*

*І ўсё ж, студэнтам быць цудоўна. Калі няма іспытаў і залікаў...*

Сяргей КАЛТОВІЧ,
выпускнік ліцэя,
студэнт І курса ФПМІ.

◆◆◆

## Кругаварот «па-ліцэйску»

*Няўжо ўсё, што звязана з ліцэем, стала для нас, яго выпускнікоў, днём учарашнім? У гэта цяжка паверыць. «Дзень учарашні» — гэта пахне пылам. А для сваіх першых выпускнікоў ліцэй застаецца месцам, дзе цябе заўсёды чакаюць, дзе пастараюцца зразумець і чым-небудзь дапамагачы, калі гэта неабходна, ды яшчэ абавязкова гарбатай пачастуюць, што таксама важна.*

*У гэтым годзе школа пераехала ў новы будынак. Шкада, што першыя ліцэісты не паспелі павучыцца ў ім — тут зараз ёсць тое, чаго так не хапала нам: адчуванне гаспадара. А быць гаспадаром — гэта ж заўсёды больш прыемна, чым госцем.*

*Сёння першы выпуск ліцэя выступае ў крыху іншай і, пэўна, больш складанай ролі. Сёння ўсе мы, за невялікім выключэннем, студэнты. Ліцэістаў вы знойдзеце ў БДПА, БТІ і, зразумела, у БДУ. Дарэчы, ёсць цікавая заўвага: многія з былых ліцэістаў сталі цяпер старастамі груп і курсаў. Ёсць сэнс падумаць над гэтай выпадковасцю (ці заканамернасцю?).*

*У жыцці былых ліцэістаў змянілася многае. Ва універсітэце фізікі ўжо не вывучаюць геаграфію і рускую літаратуру, а ў філолагаў няма ўрокаў алгебры і геаметрыі. Не вучаць ліцэістаў ва універсітэце і харэаграфіі, аб чым яны дружна шкадуюць, успамінаючы ліцэйскія ўрокі танцаў і свайго выкладчыка В. І. Гусінец. Аб ранейшым жыцці ім цяпер напамінаюць, бадай, толькі тыя ж пары, тая ж таўшчыня канспектаў ды знаёмыя твары выкладчыкаў, якія чыталі лекцыі ў ліцэі, а цяпер працягваюць вучыць сваіх выхаванцаў розуму ў сценах універсітэцкіх аўдыторый. Ліцэй стаў маленькая рэпетыцыяй універсітэцкіх заняткаў, універсітэцкай формы работы. І гэта маленькая рэпетыцыя прынесла велізарную карысць.*

*Першых выпускнікоў ліцэя чакае розны лёс. Нехта з нас, скончыўшы універсітэт, стане добрай жонкай і хатняй гаспадыняй, нехта сваім адкрыццём пераверне з ног на галаву ўсю тэорыю малекулярнай фізікі, а хтосьці яшчэ стане вядомым журналістам. Але ліцэісты заўсёды будуць вяртацца ў ліцэй. Калі-небудзь яны займуць месца сваіх выкладчыкаў. Тады ліцэй зноў стане для іх другім домам.*

*І няхай гавораць, што першы блін заўсёды комам. Але гэты першы блін — свой першы выпуск — ліцэйскія настаўнікі заўсёды будуць помніць і думаць пра яго з радасцю і лёгкай настальгіяй, як яны самі прызналіся на выпускным вечары.*

*Наталля КОРСАК,*
*выпускніца ліцэя,*
*студэнтка І курса філфака.*

◆◆◆

## ЛІЦЭЙ — ДОБРАЗЫЧЛІВАЯ МАЦІ

*Жыццё імкліва рвецца наперад, яно не шкадуе ні маладосці, ні цудоўных дзён... Цяпер, калі я вучуся на І курсе філалагічнага факультэта БДУ, кожны дзень прыходзяць на памяць усе цяжкасці і хвіліны захаплення.*

*Ліцэй — гэта тое, што застанецца ў душы, магчыма, назаўсёды. Таму што нельга забыць усе тыя вечары, семінары, гутаркі. Сёння крыху з усмешкай успамінаеш пра іспыты і залікі...*

*Універсітэт не забірае гэтыя ўспаміны, а яшчэ больш абвастрае, прымушае думкамі акунуцца ў добры ўчарашні дзень.*

*І сёння вучоба ў ліцэі ўяўляецца як сур'ёзная справа. Калі так можна параўнаць, то я ліцэй назвала б добразычлівай маці, якая асцярожна, каб не пакрыўдзіць, не спалохаць, прывучае, рыхтуе да будучых цяжкасцей. Універсітэт жа — гэта даволі суровы бацька, які ўжо ўпэўнены, што нас прывучылі да адказнай працы, і наўмысна стварае шмат цяжкасцей на шляху. Але гэта толькі спачатку здаецца. Хутчэй за ўсё, самі студэнты штучна ствараюць такія цяжкасці, не выконваючы ўсё своечасова.*

*Але ж ліцэй — гэта пратаптаная сцежка, якая не зарастае бясследна. І хочацца выказаць шчырую падзяку ад імя ўсіх студэнтаў-першакурснікаў, выпускнікоў ліцэя, нашым выкладчыкам, якія былі і нашымі сапраўднымі настаўнікамі ў жыцці, дапамагаючы ўпэўнена прайсці гэтай непаўторнай сцежкай. Шчыры вам дзякуй і нізкі паклон!*

Алена ДЗЯРКАЧ,
студэнтка І курса
філфака.

ХВАЛЕБНАЯ ПЕСНЯ

# МАЁ АДКРЫЦЦЁ ЛІЦЭЯ,

## або Краіна, якой няма на карце

Року Боскага 1991-га лёс завёў мяне сюды, у ліцэй, за што я яму бясконца ўдзячны: да таго часу абрыдла мне агульнаадукацыйная школа бязмежна.

Мой вопыт у пэўным сэнсе унікальны: я трапіў не ў 10-ы, а ў 11-ты клас. 10-я, прыходзячы ў ліцэй, спачатку не знаёмы адзін з адным, не маюць уяўлення аб ліцэі і з'яўляюцца раз'яднанай масай. Я ж трапіў у 11-я, а гэта ўжо адно цэлае, куды мне трэба было ўліцца...

### ПЕРШАЕ ЎРАЖАННЕ

Будынак ліцэя спачатку зрабіў на мяне шакіруючае ўражанне. Але першае ўражанне аб ліцэі — гэта не будынак, а людзі.

Першы ліцэіст, з якім я пазнаёміўся, Сяргей Балашчанка з 11-Р класа, дзе, дарэчы, вучуся цяпер і я. З астатнімі аднакласнікамі (дакладней, алнакласніцамі) я вырашыў пазнаёміцца здалёк. На працягу першага дня і яшчэ многіх я безупынна паціскаў чыесьці рукі і спрабаваў запомніць імёны і твары.

Склалася ўражанне, што ў ліцэі ўсе знаёмы паміж сабой, таму ён ўяўляе сабой нейкі непрыступны маналіт. Уліцца сюды здавалася мне задачай амаль немагчымай.

### ЛІЦЭІСТЫ

Пра разняволенасць ліцэістаў гаварыць проста не буду — самі ведаеце. Уразіла іншае: такая колькасць інтэлектуальных людзей разам не сустракалася мне раней. Ліцэістаў нельга назваць геніямі ці іншым падобным словам. Яны крыху ганарацца тым, што вучацца ў ліцэі, у іх ёсць адчуванне элітарнасці, але яны не хваляцца гэтым. З імі прыемна гутарыць, выказваць сваё меркаванне.

У ліцэістаў ёсць тры галоўныя, на мой погляд, рысы: гумар, творчы пачатак і інтэлект — тое, без чаго чалавек наогул не чалавек.

### НАСТАЎНІКІ

Выкладчыкі састаў падабраўся ў ліцэі вельмі добры: ён дастаткова малады, і гэта збліжае іх з вучнямі; усе настаўнікі добрыя спецыялісты і ўсе яны — асобы, што робіць іх жывымі і цікавымі.

Розніца ў адносінах паміж настаўнікамі і вучнямі ў сярэдняй школе і ў ліцэі проста ўзрушвае, гэта сапраўдны кантраст. Калі я яго заўважыў, адразу падумаў: ліцэй — гэта тое, што трэба.

### ВУЧОБА

Як ні дзіўна, у ліцэі вучыцца лягчэй, чым у звычайнай школе. Ва ўсялякім разе, мне. Вучоба тут больш мэтанакіраваная, няма асаблівых пакут з нагоды асобных прадметаў (у мяне, напрыклад, у школе былі складанасці з фізікай). І наогул сядзець на ўроках больш цікава. Я ўпершыню пасля доўгага перапынку пачаў па-сапраўднаму вучыцца.

### ЖЫЦЦЁ ЛІЦЭЯ

Заяўляю адразу і зусім афіцыйна — у школе мяне пасля ўрокаў можна было ўтрымаць толькі з дапамогай ланцуга. Цяпер жа застаюся на гадзіны дзве — і нічога, у кайф. Самі зносіны ў ліцэі настолькі цудоўныя, што здаецца, дома няма чым займацца. Калі б не яны (гэтыя зносіны), я б, пэўна, не здолеў уліцца ў ліцэй. Розныя вечары, КВЗ і іншыя забавы не галоўнае ў ліцэі. Галоўнае — вось гэта.

### ЭПІЛОГ

Ліцэй — гэта не школа. Гэта наогул не навучальная ўстанова. Гэта краіна (амаль незалежная). Свая гісторыя, людзі, якія яе робяць, нават свая газета з'явілася (гэта рэклама «Лицейских ведомостей» — хто не ведае, што гэта такое, спытайце ў мяне). Ёсць ужо і свае традыцыі.

Некаторыя сцвярджаюць, што раней у ліцэі было больш крута і весела. Я думаю, не. Чалавек забывае ўсё дрэннае, штодзённае і непрыемнае, а памятае ўсё добрае і вясёлае. Таму ліцэй мы будзем помніць заўсёды.

Віталій ШАЛЕМАЎ,
вучань 11-Р класа.



# У ДОБРЫ ШЛЯХ!

Здаўна чалавек звязваў з надыходам Новага года новыя адкрыцці, новыя дасягненні, новыя спадзяванні, новыя радасці. І таму невыпадкова, што сустрэча года Чорнай малпы падарыла нашаму ліцэю адкрыццё самабытнага драматычнага калектыва пад кіраўніцтвам настаўніка беларускай мовы і літаратуры Уладзіміра Іванавіча Кулаковіча. А заявіў пра сябе гэты гурток прэм'ерным паказам у святочны навагодні вечар на сцэне Дома настаўніка вясёлай жартаўлівай камедыі Янкі Купалы «Прымакі». Як мне здаецца, і выбар п'есы быў таксама невыпадковым. Бо надышоўшы год пройдзе для беларусаў пад сузор'ем двух волатаў мастацкага слова — Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сапраўдныя акцёрскія здольнасці выявілі ў пастаноўцы вучні 10-Б класа Зміцер Прымшыц, Таня Власевіч, Наташа Сурма, Пеця Рагойша, Таня Лазюк, Лёша Шэін, Раман Арлоў. Зірніце на гэтыя фотаздымкі, і вы самі пераканаецеся ў праўдзівасці маіх слоў. Хочацца выказаць словы шчырай удзячнасці гурткоўцам за песні, танцы і, галоўнае, за цудоўны настрой.

Калектыў пакуль што без імя, але я ўпэўнена, што не толькі імя, але і сваіх заўзятых прыхільнікаў яны ў хуткім часе знойдуць.

Новых прэм'ер табе, беларуская суполка, новых песень!

Наташа ЕЎДАКІМЕНКА.

# КАЛІ ЛІРЫКАМ НЕ ДА ЖАРТАЎ

Пра жыццё фізікаў у ліцэі мы ведаем ужо шмат (памятаеце вячоркі «Калі фізікі жартуюць»?). А што лірыкі? Наталіць інфармацыйны голад згадзіліся Вольга Уладзіміраўна ПРАСКАЛОВІЧ, Лера Мікітаўна РУБАШНАЯ і Мікалай Валяр'янавіч КНЫШ — выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры.

ЛІЦ.: Ці ёсць розніца паміж ліцэістам сённяшнім і мінулагоднім?

В. У.: Ёсць. Ліцэісты сталі больш упэўненымі ў сабе і сваіх сілах.

М. В.: У мінулым годзе дзесяцікласнікі амаль не задавалі пытанняў, калі я гаварыў, хто будзе чытаць ім спецкурс. А ў гэтым годзе ўжо пытаюць: «А ён жанаты?»

Л. М.: У сённяшняга ліцэіста павялічылася адказнасць за вучобу. Прычына таму — канкурэнцыя вячэрняга ліцэя. Думаю, што выпускнікі-ліцэісты ў гэтым годзе будуць больш смелымі, чым выпускнікі мінулага года.

ЛІЦ.: Калі б вы былі чараўніком (чараўніцай)...

В. У.: ...стварыла б для ліцэя ўтульны будынак, аснашчаны па апошняму слову тэхнікі. Галоўнае, каб ён стаў для ліцэістаў сапраўдным домам, дзе яны знаходзілі б спагаду, добразычлівасць і ўзаемаразуменне.

Л. М.: ...пабудавала б нармальную залу для ўрокаў харэаграфіі.

М. В.: А я б — сталоўку.

ЛІЦ.: Што б Вы падарылі ліцэю на імяніны?

Л. М.: Добрыя адзнакі ліцэістам. Прыемныя ўсмешкі.

М. В.: Свой белы капялюш.

В. У.: Хацелася б, каб ліцэістаў ніколі не пакідала надзея. Прыгадваюцца такія радкі:

Калі на сэрцы халадзее
І душыць злосці і цемры цяжар,
Вы распаліце Зорку Надзеі,
І сагрэюцца Вашы душы.

ЛІЦ.: Якую падзею Вы б назвалі падзеяй года?

Л. М.: Паспяховае паступленне нашых выпускнікоў у БДУ.

М. В.: Мой выхад на сцэну ў якасці вышывальшчыка. Дарэчы, я вышыў свой абяцаны падарунак філалагіняччкам-выпускніцам ліцэя, якія зараз вучацца ў БДУ.

Апытанне правяла
Марына АЖГІРЭЙ.

А хто-небудзь калі-небудзь спрабаваў звярнуцца да звычайнага загадчыка ліцэйскай гаспадаркай? Ведаеце: не. Між тым, ён з зямнымі праблемамі сам-насам змагаецца. Ды й на жыццё не чуваць каб скардзіўся. Але ж думкамі сваімі падзяліцца не адмовіўся. Дзякуй Вам, Аляксандр Віктаравіч ВАРАНЕЦ.

«НЯЛІШНІ» ЧАЛАВЕК

# ТАКАЯ ВАЖНАЯ «ЭПІЗАДЫЧНАЯ» РОЛЯ

— Звычайны вобраз: загадчык гаспадаркай — грозны чалавек, у якога цяжка нават снегу ўзімку дапрасіцца. Як Вы ставіцеся да такога стэрэатыпу? Што можаце сказаць з гэтай нагоды пра сябе?

— Снегу сапраўды цяжка дапрасіцца, бо ён знікае, ледзь з'явіўшыся. А калі сур'ёзна, я — чалавек не грозны, і ўсе пытанні, што ўзнікаюць, стараюся вырашыць станоўча. Канешне, калі мне гэта па сілах.

— Якім мерам Вы аддаеце перавагу ў барацьбе з ліцэйскім браканьерствам — паломкай сталоў, крэслаў, біццём шкла і г. д.?

— Я лічу, што барацьба з ліцэйскім браканьерствам — гэта пытанне ў першую чаргу да класных кіраўнікоў. Пакуль у нас працуюць метады пераканання. Мабыць, нам усім неабходна памятаць аб складанасцях сённяшняга гандлю і эканомікі.

— Як складваюцца Вашы ўзаемаадносіны з выкладчыцкім саставам?

— У асноўным — станоўча. Але хацелася б лепшага ўзаемаразумення і большага аптымізму.

— Як бы Вы самі вызначылі тую ролю, якую адыгрываеце ў ліцэі?

— Мне цяжка даць сабе ацэнку, з боку, зразумела, усё бачна лепш.

— У сувязі з цяперашнім эканамічным становішчам у краіне Вам ніколі не прыходзіла ў галаву думка памяняць сваю прафесію?

— Пакуль такая думка ў мяне не з'яўлялася, бо я зусім нядаўна памяняў прафесію. Усё залежыць ад таго, як эканамічная сітуацыя будзе мяняцца ў далейшым.

НА ЛЮДЗЕЙ ПАГЛЯДЗЕЦЬ...

# РАЗАМ ДОБРА ВАНДРАВАЦЬ

Чуткі аб турпаездцы, што мае адбыцца на зімовых канікулах, хадзілі яшчэ ў лістападзе. І вось, нарэшце! Мы атрымалі пуцёўкі. Мы — амаль увесь дзесяты беларускі, тры чалавекі з адзінаццатага беларускага і нашы настаўнікі — Уладзімір Іванавіч Кулікович і Вольга Уладзіміраўна Праскаловіч.

Другога студзеня. Турцягнік «Мінск — Пскоў — Талін — Санкт-Пецярбург — Мінск» неахвотна крочыў у ноч, а ў нашым дванаццатым вагоне пачыналася вясёлае турысцкае жыццё.

Неўзабаве ўсе скончылі намаганні ўпіхнуць у сябе ўсё тое, што было ў нашых сумках, бо, нарэшце, зразумелі, што магчымасці чалавечага страўніка ў адносінах змяшчальнасці ўсё ж такі абмежаваныя. Уладзімір Іванавіч вырашыў згладзіць выкліка637ны гэтай думкай сум і прапанаваў нам спачатку паразвязваць лагічныя задачкі, а потым папрактыкавацца ў складанні эпіграм. Затым пелі песні. Увогуле, было весела, таму і заснулі мы — хто а першай, а хто і а чацвёртай гадзіне ночы.

Першым горадам у нашым маршруце значыўся Пскоў, куды мы прыехалі раніцай. Па цягніковаму радыё аб'явілі, што экскурсія па гораду пачнецца пасля абеду. Параіўшыся, мы вырашылі да абеду зрабіць самастойную экскурсію, кажучы па-простаму, пахадзіць па Пскову.

Зразумець усе прывабнасці такога шпацыру зможа толькі той, хто: а) ужо спрабаваў гуляць па тратуары, які знаходзіцца пад кашай з пяску, снегу і вады глыбінёй у 10 — 15 сантыметраў; б) зведаў пачуццё спуску, або, лепш сказаць, палёту з амаль адвеснай горкі ў вельмі мокрую лужыну; чатыры або пяць разоў за тры гадзіны азнаямлення з горадам трапляў на вуліцу Савецкую (ці то вуліца была занадта вялікая, ці то проста мы па колу хадзілі, цяпер ужо не памятаю).

Пасля абеду мы паехалі знаёміцца з горадам ужо арганізавана. Даведаліся аб гісторыі Даўмонтава горада, пабывалі ў музеі ў Паганкіных палатах, палюбаваліся Псковам з акенцаў-байніц вежы Пскоўскага Крамля. І выявілася, што Пскоў не толькі «вечна галодны», як яго досыць трапна абазваў нехта з нашых журналістаў і як мы можам падумаць, гледзячы на сумкі псковічаў, пакідаючых Мінск, а яшчэ і вельмі прыгожы горад, і гэта яго рыса прымушае закрыць вочы на ўсе недахопы.

Пра Талін, які мы наведалі ў наступны дзень, можна гаварыць бясконца. Ціхія завулкі старога горада, безліч помнікаў архітэктуры, касцёлы, царквы, будынкі, у якіх у розныя часы высокія людзі размаўлялі аб высокіх справах. Але перадаць звычайнымі словамі ўражанні ад Таліна нельга, бо гэта мелодыя, верш, цудоўная казка — тыя, хто быў там, знойдуць азначэнне самі.

Калі праз два дні, ужо ў Санкт-Пецярбурзе, мы накіраваліся на Варшаўскі вакзал, цяжка было паверыць, што паездка заканчваецца. Няўжо? Так хутка? Суцяшала хіба толькі тое, што за плячыма ў нас ўсяго па 15 — 16 гадоў, а значыцца, наперадзе яшчэ шмат такіх паездак, у якіх на крыўды і спрэчкі проста не хапае часу (хапіла б на сон!), у якіх сціраюцца межы паміж настаўнікам і вучнем, паездак, у якіх нават макароны на снеданне і вячэру кожны дзень не здаюцца такімі агіднымі ( бо макароны — гэта не галоўнае)...

Я яшчэ шмат не паспела вам расказаць. Не расказала пра дыскатэку на пероне, пра лівень, які нас напаткаў у Таліне (вы часам не спрабавалі залезці ў футры пад халодны душ? Атрымаеце досыць дакладнае ўяўленне аб гэтым дажджы), пра гульні, якія праводзіліся па радыё, і конкурсы, умовы якіх аб'яўляліся па таму ж цягніковаму радыё, пра... Але ўсяго не пералічыш! Значна лепей было б з'ездзіць самім. Заяўляю з усёй адказнасцю: не пашкадуеце!

Мілана ШУШКЕВІЧ,
10 беларускі клас.

# ЦІ ЗМОЖАЦЕ СКАЗАЦЬ АДНЫМ СЛОВАМ?

**1. Што такое каханне?**

— Адным словам пра каханне не скажаш.

**2. Колькі разоў можа быць каханне?**

— Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека. Я думаю — аднойчы.

**3. Колькі Вам было гадоў, калі Вы ўпершыню закахаліся?**

— Я закахаўся ў 9 класе. Гэта была вялікая трагедыя. Я быў самым маленькім у класе, на фізкультуры стаяў апошні, а яна была высокая...

**4. Уявіце такую сітуацыю: Вы зайшлі ў клас пасля званка, а на стале цыдулка «Мы Вас вельмі любім, але кіно вельмі цікавае». Ваша рэакцыя?**

— Пайшлі так пайшлі. Шкада, бо экзамены здаваць жа трэба. (Жадаючыя могуць правесці гэты эксперымент).

**5. Калі б на Вашых занятках вучні ўважліва Вас слухалі, але пры гэтым хадзілі па класу, перакусвалі?..**

— На працягу дыскусіі — калі ласка, хадзіце, падыходзьце да дошкі... Але не адначасова.

**6. У чым сэнс жыцця?**

— Трэба імкнуцца, каб станоўчыя эмоцыі пераважалі над негатыўнымі. Жыццё павінна пакідаць светлы след ва ўспамінах іншых людзей. Неабходна выпраменьваць дабро.

**7. Ваша любімае выказванне?**

— Ласкава: «Ахламоны вы мае!»

**8. Ваша пажаданне на дарогу ліцэістам?**

— Як бы ні склалася жыццё — быць Чалавекам.

**9. Якое ў Вас вайсковае званне і што б вы ўзялі як кіраўнік з арміі?**

— Старлейт. Не адмовіўся б ад дзяржаўнага забеспячэння выкладчыкаў (харчаванне, абмундзіраванне, даплата за «зорачкі»).

Пэўна, сапраўдныя ліцэісты з першых слоў гэтага інтэрв'ю пазналі таго, хто адказваў на пытанні. Для астатніх паведамляем: гэта быў намеснік дырэктара па навуковай рабоце **Генадзь Уладзіміравіч ПАЛЬЧЫК.**

## ЛІЦЭЙ ПАЭТЫЧНЫ

**Прысвячаецца 11-Р класу, напісана агульнымі намаганнямі яго вучняў.**

Как настали дни холодные,
Дни тоски тягучей,
Дни печали неизбывной,
Собралися мы подле
Самовара нашего уютного,
Дабы думать думу тяжкую,
Думу горькую о судьбинушке
Группы нашей горемычной,
Ибо издревне жила она
В муке безысходной,
В скуке беспричинной,
Потому как вгрызался беспрестанно
В шею ея лебяжью
Зверь редкостный, ископаемый.
И так мы к нему притерпелися,
Что даже кликали давеча
Его, змея, запросто: сплином.
Дни долгие, часы длинные
Желали мы извести
Существо его гнусное, неразумное,
Питавшее душеньки нежные,
К ласке приученные,
Ядом жгучим, тоской-отравою.
Затуманилися очи наши ясныя,
Опустилися рученьки белыя,
Подкосилися ноженьки резвыя.
И невзвидели мы Свету Божьего
Из-за лапьев его звериных, пакостных,
Ибо ждала нас доля горькая —
В безвременьи маяться,
Аки в киселе вязком, тягучем.
И, отчаявшись, буйны головушки
Мы повесили,
Погрузившись в сон дремотный.
Ни много ни мало,
А пролетели лета жаркия, зимы вьюжныя.
Задумали люди неугомонныя
В обители, в горести застывшей,
Высвободить крылышки наши
Из пут, волю сковавших.
Однако же, паче чаяния ихнего,
Зря оне — ан не в силах
Зверя одолеть, умертвить,
Ибо стал зверь ентот
Люб нам до невозможности.
А люди неугомонныя
Уразуметь никак не могут
Чувства нашего нежного, материнского,
Потому как неведомо им,
Что взлелеяли мы зверя нашего,
Аки дитё родное,
Выпестовали его,
Словно кровей он благородных:
Игрою на пианине
Слух его услаждали,
Кормили его пирожками с повидлой
В количествах необъятных,
Речи изысканной его обучали.

Как-то раз глядь — ан
У зверя нашего милого
Лицо-то и наше.
И пошли мы
До покровительницы нашей —
Елены Прекрасной,
Дочери Олега Вещего,
Дабы поведать ей о радости великой —
О приручении зверя дикого, непокорного.
И возрадовалась она разом с нами,
И повелела нам и впредь лелеять его,
И оберегать, дабы люди неугомонныя
Не завлекли к себе
Зверя нашего доверчивого,
Чем мы и заняты таперича
Денно и нощно...

## НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ САВЕТЫ!

Няпоўных два гады таму ў слаўным горадзе Менску на фоне шэрай тыповай савецкай адукацыі з'явілася адзіная, відаць, на той час яркая пляма.

Кантраст нашага роднага і блізкага ліцэя з вышэйназванай савецкай адукацыяй такі вялікі, што пасля паступлення сюды некаторы час адчуваеш сябе быццам не ў сваёй талерцы, але ў хуткім часе ўваходзіш у рытм ліцэйскага жыцця і ўжо не ўяўляеш сваё існаванне без гэтых сцен, якія за кароткі час паспелі прапітацца атмасферай незалежнасці, сяброўства і свабоды думак. А ў гэтым годзе ліцэісты, дзякуючы ў многім Але Васільеўне Вінічук, намесніку дырэктара па выхаваўчай рабоце, атрымалі яшчэ больш свабоды — улада перайшла ў рукі саветаў (толькі не праводзіце аналогіі з Краінай Саветаў — нашы, ліцэйскія, саветы сфарміраваны сапраўды з народа, дакладней, з ліцэістаў).

А цяпер — да больш падрабязнага агляду нашага жыцця. Гэты год, як і папярэдні, даволі багаты на разнастайныя вечары і іншыя цікавыя мерапрыемствы, сярод якіх можна адзначыць дзявочы мініфутбол (гэта, як адзначылі гледачы, нешта вясёленькае), вечар-візітку, на якім давялося папацець дзесятым класам, каб рассмяшыць гледачоў. Асабліва вылучаўся знакаміты 10 $РФ_2$, прыпеўкі якога даводзілі залу да бурнага рогату (і гэта яшчэ вельмі мякка сказана!).

В. КУЛІКОВА.

## Антон АРЦЁМЕНКА

Запустынены роспачны крык
Выючы паўтарае завея.
Адыходзіць апошні цягнік.
Пачакай мяне, пані Надзея.

Пакручастыя стужкі дарог
Я прайшоў да цябе,
не стаміўся
І квіток на цягнік той зьбярог,
А цяпер безнадзейна спазніўся

А дагнаць цябе ўсё-ткі магу,
Бо за спінаю вырасьлі
крыльлі.
Але падаю ў сьнег на бягу,
Патанаючы ў кволым
бясьсільлі.

А сасьню я цяплюткія сны,
Ледзь прымружыўшы сонныя
вейкі.

Абнадзейлівы подых
вясны
Ніспадзе на халодныя рэйкі.

І пасьведчаць мне вочы твае,
Што ты праўда на сьвеце
існуеш.

І я прымхі адкіну свае,
Ты праўдзівы мой голас
пачуеш.

# НОЧНЫЕ ЖИТЕЛИ

(незлая сказка)

### ПРОЛОГ

Домик, обвалявшийся в желтой штукатурке, стоит на пригорке, и сквозь паутину заморозков выглядывают его жители.

...Из дневных жителей — только раскормленная крыса с ленивыми лапами и добродушной мордой.

Наивная администрация долго и высоко подвешивала вазон с нежным, как коровьи глаза, цветком. Крыса в это время небрежно валялась под теплой батареей, недалеко от администраторских ног, и тихо себе в усы посмеивалась.

Потом он долго еще раскачивалась в уютном, как гнездышко, вазоне и думала о смысле бытия.

Еще одна зверюшка доверчиво свернулась калачиком на скользком столе, облизывая, как сахар, кусочек мела.

Ей каждую ночь снится, будто луна прислала для нее немного сыру, и зверюшка от удовольствия скребет когтем по столу.

Днем она забивается под подоконник в коридоре и честно думает, что пятнышки на мраморном полу — кусочки сала, и целый день выгрызает их, обиженно дрожа лысым хвостиком.

— Оставил бы кто колбасную шкурку...

Вдумчиво мудрое, лохматое и в тельняшке с бахромой шаркает по светлым квадратам окон, выдавленных луной, рваными тапками. Это домовой. У него много глаз, которые свисают на ниточках по всей тельняшке, он бормочет вечную сказку. В глаз, висящий на его спине, часто заглядывает луна.

Домовой что-то знает и поэтому всегда улыбается; все думают, что это тихо помешанный домовой.

На потолке, будто туман, расстилается спящее вислоухое привидение. Оно так храпит днем, что мешает людям, которые, правда, подозревают, что просто тарахтят неоновые лампы.

Другое мутное и бесшумное обожает желтый цвет и часто прилипает к штукатурке. Иногда не удерживается и, громко скуля, звенит всеми окнами на асфальт; долго потом притворяется лужей и созерцает чердак...

Среди ночных жителей есть прозрачный и безобидный ученый-теоретик. Он каждую ночь пытается выяснить тайну блестящей штуки с полосатым хвостом, которая стоит на белом подоконнике в сырой комнате и отбрасывает тень, похожую на короля. Теоретик сидит рядом на корточках и дышит на блестящий бок — выдувает туман.

На хвост штуки в это время карабкается практик.

На подоконнике в коридоре живет поэт, в белых перчатках и с грустными бессонными глазами. Одна перчатка иногда нечаянно падает в лужу со зрачками, та малодушничает и прилипает к стенке серо-оранжевым разводом.

### ЭПИЛОГ

А потом наступает утро, и тени уныло плетутся к окнам, пыль возвращается на свои места, а замки на дверях суетливо защелкиваются.

И большая мохнатая собака на коньках долго шныряет вокруг домика, присыпая снегом многочисленные следы лапок, хвостов, ступалок и когтей.

Раскормленная крыса неуклюже спрыгивает с вазона, напрочь вырывая грустно-прекрасный цветок и, растопив в помятой жестяной кружке снег, разливает у входа маленькие и большие лужицы причудливой формы. А потом удаляется, поглощенная мыслями о превратностях бытия, и оставляет пожилую, слегка ворчливую, но беззлобную, как препарированный моллюск, уборщицу в привычном недоумении.

Недоумение администрации менее созерцательно. И более агрессивно. Но когда становится тихо и ясно, что цветок все-таки не вернуть, администрация смиренно направляет свои стопы в область педагогических изысканий.

Пугливые Птички-Базедки одержимо и стремительно слетают с часов, нарушая их вдумчивую чинность. Часы недовольно моргают, а цифры и вовсе приходят в бешенство.

Тысяча Тучных Козявок начинает неистовствовать в медном колпаке — звенит звонок — и странные двуногие существа с портфелями в руках и чем-то щемяще-пристальным в глазах плетутся к желтому домику, чтобы заняться обычным времяпровождением, которое они называют учебой.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

13 лютага

Зак. 2181.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.